# Штурм замка Пулен

Словы Змітра Сасноўскага

Музыка Стары Ольса




*Замак Пулен літвіны бароняць,*
*Там кіруе магутны ваяр*
*Князь Маргер і дзве тысячы ваяў*
*Адбіваюць бясконцы пажар.*
*І тысячы раз мячом рубіць князь*
*Каля брамы, на вежах, сцянах,*
*Адкідвае штурм, б'ецца як тур,*
*Але менее моц у руках.*

*Катапульты, тараны, гарматы*
*Праламілі вялізны прагал,*
*Кнехты ломяцца, бразгаюць латы,*
*Там літвінавых трупаў завал.*
*Да рабства ісці не па жыцці,*
*Скарб літвіны пачалі паліць,*
*Дзядоў і кабет, дзетак услед*
*І сябе вырашаюць забіць.*

*Не засталі прытомным нікога,*
*Немцы ў Пулен зайшлі нежывы,*
*Не чакалі захопу такога,*
*Замак мёртвы стаяў назаўжды.*
*Літвіны спрадвек як страшны грэх*
*Не прымалі рабоў нізкі лёс,*
*Каб ганьбы не мець у гонары смерць*
*Без сумніваў, пакут і без слёз.*

© Stary Olsa